# *Чалавек, які паставіў помнік землякам*

**Мікалай Ільючык, жыхар вёскі Багданаўка Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці, устанавіў мемарыял аднавяскоўцам — ахвярам Халакоста.**

Мікалай Ільючык, будучы падлеткам, даведаўся ад бацькоў, што ў жніўні 1941 года нацысты расстралялі ля вёскі шэсць аднавяскоўцаў-яўрэяў — двух юнакоў 18—19 гадоў і чатырох мужчын ва ўзросце ад 40 да 50 гадоў. А іх родных і сваякоў вывезлі на знішчэнне ў гета вёскі Пагост Пінскага раёна. Паводле слоў М.Ільючыка, усё жыццё ён марыў аб тым, каб увекавечыць памяць загінуўшых, бо нават у кнізе серыі "Памяць. Лунінецкі раён" пра іх не ўпамінаецца. *"Так як мы з жонкай пратэстанты, то вырашылі, што дзесятую частку даходаў, якая расходуецца на справы Божыя, накіруем на ўзвядзенне помніка. Сабраныя грошы былі накіраваны на набыццё неабходных матэрыялаў, а сам мемарыял па маім праекце мне дапамаглі зрабіць сябры і сыны, адзін з якіх вучыцца ў пятым класе, а двое — у трэцім.*

*У аснове мемарыяла ляжыць бетонны круг з выявай зоркі Давіда. На крузе як сімвал памяці і пакут ахвяраў устаноўлена металічная труба ў выглядзе агарка памінальнай свечкі, аблытаная калючым дротам. Са свечкі на дрот сцякаюць шэсць слязінак, навечна замерлых у метале. З-за таго, што імёны загінуўшых мне невядомыя, а прозвішчы асацыююцца з мясцовымі вулічнымі мянушкамі расстраляных, то на базальтавай пліце мемарыяла ўказана толькі інфармацыя аб акалічнасцях трагедыі"*, — паведаміў М.Ільючык. Паводле яго слоў, раённая газета "Лунінецкія навіны" ўзвядзенне і адкрыццё помніка ў Багданаўцы абышла маўчаннем.

**Марат ГАРАВЫ.**